**VII КАНГРЭС АДС**

На Кангрэсе дэмакратычных сіл Беларусі, які прайшоў у Мінску 26 – 27 мая, зацверджана стратэгія дзеянняў Аб'яднаных дэмакратычных сіл.

У новы склад Палітычнай рады АДС на Кангрэсе абраны 44 прадстаўнікі палітычных партый краіны і грамадскіх рухаў. Пасля завяршэння Кангрэса прайшло першае пасяджэнне новай Палітычнай рады, на якім былі зацверджаны яе 4 сустаршыні – **Вінцук Вячорка**, **Анатоль Лябедзька**, **Сяргей Калякін** і **Анатоль Ляўковіч**.

На Кангрэсе была таксама прынята "Малая Канстытуцыя" (праект Канстытуцыйнага закону аб органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання) і эканамічная платформа АДС. У галасаванні па гэтых пытаннях на Кангрэсе ўзялі ўдзел 570 дэлегатаў.

Напярэдадні Кангрэса ўлады датэрмінова вызвалілі **Кацярыну Садоўскую**, **Паўла Севярынца** і **Мікалая Статкевіча**, якіх беларуская і міжнародная дэмакратычная супольнасць лічылі палітычнымі зняволенымі.